3 12 2015 г.

*Вострыя адчуванні*

# ЯК Я БЫЎ ЭЛЬФАМ 80-га ЎЗРОЎНЮ

## Калі стрэс перамагаюць са шчытом і мячом



**...Мы стаім, сціскаючы ў руках мячы, і з-за шчытоўназіраем за сапернікамі, якія гэтак жа выстраіліся насупраць нас. Хто пераможа? Але на роздумы ўжо не застанецца часу: «заспявала» цеціва, прагучалі баявыя клічы... Бітва пачалася! Напэўна, вам гэта нагадала сцэну з гістарычнага або фэнтэзійнага рамана? Насамрэч, прыкладна так выглядаюць баявыя ролевыя гульні. Не так даўно яны з'явіліся і ў Беларусі.**

### ТЫ «БАЕЦ» АБО «ТАКТЫК»?

Доза адрэналіну і магчымасць прадэманстраваць свае навыкі валодання мячом, дзідай і лукам прыцягваюць да іх аматараў фэнтэзі ва ўсім свеце. Усё, што робяць удзельнікі, успрымаецца як дзеянні выбраных імі персанажаў. Прычым паўнавартаснае гульнявое дзеянне можа быць маштабным і расцягвацца не на адзін дзень. Для гэтага ў некаторых краінах арганізоўваюцца спецыяльныя лагеры для падлеткаў. Адмысловая амуніцыя, заданні і атмасфера пераўзыходзяць магчымасці любых камп'ютарных гульняў. Ды і хіба можна іх параўноўваць?

У Беларусі ролевыя гульні «жыўцом» толькі набіраюць сваю аўдыторыю. Як прызнаюцца іх арганізатары, пра маштабнасць у нас пакуль гаварыць заўчасна. Гульнявое дзеянне ў першую чаргу скіравана ў «баявы бок», калі дружыны сустракаюцца на полі бою, якім можа быць як спартзала, так і прыродны ландшафт. Сябры, калегі па офісе могуць у камандным баі высветліць, хто геніяльны тактык, а хто таленавіты баец-адзіночка. Галоўнае — памятаць, што гэта ўсё ж толькі гульня, і лепш застацца пасля бітвы ў добрых адносінах. А гэта, скажу я вам, нялёгка. Падчас гульнявых баёў страсці проста кіпяць!

Нядаўна, дарэчы, падобныя баі прайшлі паміж студэнтамі БДУ. На маё здзіўленне, нямала сярод «вараю» было і дзяўчат. Арганізатары кажуць, што бываюць і такія ваяўніцы, якія могуць даць хлопцам фору. Калі камандзір мудры, ён выкарыстоўвае рэсурсы кожнага гульца напоўніцу. Важна ведаць, хто на што здольны і з якой зброяй б'ецца найбольш эфектыўна. Арсенал уражвае! Прысутнічае практычна ўсё, чым ваявалі ў сярэднявеччы. Зразумела, што зброя бяспечная. Нанесці сур'ёзны ўдар вельмі праблематычна. Максімум, да чаго можа дайсці, — сіняк. Забаронены ўдары ў галаву і ніжэй пояса, моцныя амплітудныя і колючыя ўдары мячом. Таксама забаронена любое жорсткае фізічнае ўздзеянне. За парушэнне правілаў вельмі жорсткіх байцоў арганізатары і суддзі выключаюць.



### АДРЭНАЛІНУ ХОПІЦЬ УСІМ!

Так, так, і я прайшоў праз гэта! Ну а як інакш зразумець, што адчувае эльф падчас бітвы? Я выбраў два кароткія мячы. У Старажытным Рыме гладыятар, які іх выкарыстоўваў, называўся «дымахер». Як аказалася, гэты стыль сярод гульцоў не вельмі папулярны, бо змагацца двума клінкамі адначасова складана. Але калі папрактыкавацца, аказваецца, што спосаб досыць эфектыўны. Можна адначасова блакіраваць саперніка і наносіць яму ўдары. Але ў той жа час важна ўмець ухіляцца ад стрэл, што больш складана, не маючы шчыта. Некалькі раўндаў такіх гладыятарскіх баёў могуць замяніць невялікую прабежку, а выпрацаванага адрэналіну павінна хапіць адразу на двух чалавек. Па словах арганізатараў, ёсць гульцы, якія настолькі захапіліся атрыманнем вострых адчуванняў, што аб'ядноўваюцца ў «кланы» і ўмела выкарыстоўваюць тактыку і стратэгію на палях бітваў. Бо ў першую чаргу гэта камандны від гульні, і шмат што ў ёй залежыць ад зладжанасці дзеянняў усёй групы. Клан можа складацца з 4-8 чалавек. Каманда павінна мець свае дэвіз, герб і сцяг. Тыя гульцы, якія адыгралі некалькі баёў, становяцца ветэранамі і атрымліваюць некаторыя гульнявыя бонусы ад арганізатараў, а таксама павагу каманды.

Як удзельнік, я зразумеў, што ёсць у праекце і некаторыя «слабыя бакі». Гульня ў першую чаргу мае на ўвазе сумленнасць. Прапусціў удар мячом у корпус — прызнай, што цябе перамаглі. Але ў запале бітвы некаторыя ўдары проста не заўважаюцца. Гэта вам не пейнт-бол, дзе пераможцаў рассудзіць фарба. У гульні, вядома, ёсць суддзі, якія назіраюць за ходам паядынка. Аднак часам яны не паспяваюць сачыць за ўсімі. Гэтым карыстаюцца гульцы і... самастойна ўваскрасаюць з «мёртвых». Прычым гэта адбываецца часцей за ўсё непасрэдна ў тыле каманды-саперніка, што прыкметна скарачае шэрагі праціўніка. Вядома, калі арганізатары заўважаюць, то «некраманта» адлучаюць ад «бітвы». Галоўны ж плюс гульні ў тым, што можна на сабе адчуць, як гэта — стаяць у пешым страі са сваімі сябрамі па камандзе. Ды яшчэ і пастарацца перамагчы. А адчуванне, шчыра кажучы, вельмі таго вартае.

Ілья КРЫЖЭВІЧ.
kryzhevich@zviazda.by

*Вандруйце смачна!*

# АД НАШАГА СТАЛА... ІДЗЁМ ДА ВАШАГА

**У нямецкім горадзе Грайфсвальдзе ёсць традыцыя: два разы ў год яго жыхары аб'ядноўваюцца ў каманды і наведваюцца ў госці адно да аднаго. Яны знаёмяцца, частуюцца, а потым ідуць у іншае месца. Студэнткі пятага курса факультэта міжнародных адносін БДУ вырашылі арганізаваць такое ж мерапрыемства ў Мінску. І ў іх гэта атрымалася!**

...Нядаўна прайшлі ўжо трэція «Смачныя вандроўкі». Мы сабралі каманду з трох чалавек. Назвалі сябе «Экспертамі» і адправілі заяўку арганізатарам.

Змест вандровак кожны раз мяняецца. Тэмай першых было студэнцкае жыццё, другіх — французска-італьянская кухня, а гэтых — «руская рулетка». Арганізатары выбіралі тры абавязковыя інгрэдыенты і страву, якую будуць гатаваць каманды. Нам дасталіся чыпсы, кукуруза і смятана. З усяго гэтага мы павінны былі зрабіць закуску. Таксама нам далі два адрасы, дзе нас чакалі з асноўным блюдам і дэсертам.

Мы прыгатавалі салату і накрылі на стол. Да нас прыйшлі каманды «Смачных хімікаў» з хімфака і «Неўскі праспект» з філфака БДУ. Даведаліся, што амаль усе дзяўчаты таксама ўдзельнічаюць у мерапрыемстве ўпершыню. Толькі Аня Рэўт з «хімікаў», студэнтка другога курса, ужо выступала ў ролі вандроўніцы. Яна распавяла нам пра японцаў, якія ў мінулы раз запрашалі гасцей: «Мы трапілі на трэцюю страву да каманды «Гейша». У ёй быў хлопец, які прафесійна гатаваў дэсерты. Звалі яго Ю. Ён зрабіў тры віды цірамісу: класічнае, з клубніц і з зялёнай гарбаты «матча», якая спецыяльна была прывезена з Японіі. А ўпрыгожылі іх надпісамі на беларускай і японскай мовах. Было вельмі смачна. Дарэчы, іх страва стала найлепшым дэсертам».

Потым усе мы выправіліся да каманды «Лобстэры» ў Рошчу, у інтэрнат БДУ. Там нас чакала не толькі смачная страва, але і святочная атмасфера. Дзяўчаты ўпрыгожылі пакой навагоднімі ліхтарыкамі і гірляндамі, уключылі музыку. Таня Грыдзюшка, пяцікурсніца факультэта міжнародных адносін БДУ, расказала нам пра тое, як іх каманда ў мінулы раз забаўляла гасцей: «На тых вандроўках арганізатары вырашылі арганізаваць яшчэ і конкурс на найлепшую забаву. Таму мы прыдумалі дзве гульні: «Багет знаёмства» і «Угадай-ка». У першай патрэбна было адкусваць ад багета і перадаваць яго суседу. Пры гэтым кожны раз трэба было адказваць на пытанне. Мы задумалі гэтую гульню для знаёмства, таму цікавіліся, з якіх гарадоў нашы госці, які ў іх любімы фільм ці якое хобі. А пераможцу другой гульні прысуджалі ганаровае званне «Сапраўдны француз», таму што гэта была віктарына на веданне гісторыі і культуры Францыі».

Павячэраўшы ў дзяўчат, мы паехалі на дэсерт у завулак Мініна. Цемра. Ідзём туды, невядома куды. У нас ёсць карта, але яна не дапамагае — трапілі ўжо на нейкую будоўлю... Вырашылі патэлефанаваць, і дзяўчынка з каманды «Бальбіна» выйшла насустрач.

На дэсерт частавалі тортам. І зноў нам пашчасціла на гаспадароў: у іх камандзе была адна з арганізатараў «Смачных вандровак» Каця Міхайлоўская. Яна падрабязна расказала, адкуль з'явілася такая ідэя: «Зараз мы арганізуем вандроўкі ўдзвюх: я і Анжаліка Дрозд. Дагэтуль з намі была яшчэ і Юля Кірэева, якая і з'яўляецца нашым ідэйным натхняльнікам. Яна была ў Грайфсвальдзе на студэнцкім фэсце і там упершыню ўдзельнічала ў аналагічным мерапрыемстве. Гэта невялікі гарадок, жыццё якога скансцэнтравана вакол вядомага ў Германіі ўніверсітэта. Там кожны семестр арганізоўваюцца такія «вандроўкі», каб пазнаёміць жыхароў і студэнтаў. У мінскіх вандроўках удзельнічаюць каля 30–40 чалавек за раз, амаль усе — студэнты. Ёсць прыкладна пяць каманд, якія гуляюць з намі ўвесь час. Але чым больш людзей — тым больш ідэй!»

На знаёмства з кожным відам стравы ёсць ліміт часу, але на дэсерце мы затрымаліся. Пілі гарбату, елі торт, гулялі і размаўлялі. За дзень наша каманда пазнаёмілася з 18 новымі людзьмі. Пераважна гэта былі студэнты БДУ, але на "дэсерт" трапілі і архітэктары з БНТУ. А пакуль мы вандравалі, неаднойчы чулі пра цудоўную каманду хлопцаў з медуніверсітэта. Кажуць, што ў іх вельмі смачныя стравы і адны з найбольш вясёлых забаў. На жаль, гэтым разам мы да іх не трапілі. Затое ёсць нагода зноў сабраць каманду і выправіцца ў госці!


Сваю страву і гасціннасць прэзентуе каманда «Лобстэры».


Дэсерт ад «Бальбіны».


«Эксперты» да дэгустацыі гатовы!

Надзея АНІСОВІЧ,
студэнтка V курса
Інстытута журналістыкі БДУ.